**25 мая вялікім гала-канцэртам завершыцца юбілейны, XX фестываль мастацтваў "Арт-мажор" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, які цягам двух месяцаў праходзіць на лепшых сцэнах краіны.**

# "Арт" у мажоры

Бліжэйшы канцэрт — вечар духавой музыкі 23 мая ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. У праграме "Гучаць фанфары", як паведаміў яе мастацкі кіраўнік Віктар Валаткович, выступяць аркестр "Светач" пад яго кіраўніцтвам, ансамблевыя гурты, якія закранаюць усё суквецце духавых — ад традыцыйных да народных, — вакалісты Інга Кісялёва, Наталля Колб. Чакаецца ўдзел народнага артыста СССР і Беларусі, кампазітара Ігара Лучанка. Асобныя нумары будуць упрыгожаны харэаграфічнымі пастаноўкамі і нават выхадам мажарэтак.

Сярод самых адметных фестывальных момантаў, якія ўжо адбыліся, — адкрыццё свята, дзе гучала выключна айчынная музыка. Перад слухачамі паўсталі "Старонкі музычнай спадчыны" — ад старадаўняга "Полацкага сшытка" праз апрацоўкі народных мелодый да твораў кампазітараў XX стагоддзя: Аляксея Туранкова, Яўгена Глебава, Аляксандра Друкта, Віктара Помазава, Генадзя Ермачэнкава, Уладзіміра Кур'яна і іншых. Кожны з творчых калектываў прадэманстраваў сваю індывідуальнасць: ансамблі "Баламуты" (пазней ён даваў і сольны канцэрт), "Беларуская песня", "Грамніцы", "Дудачка", капэла "Гуды", асобныя салісты і, вядома, Беларускі народны аркестр БДУКіМ — лаўрэат Гран-пры Міжнародных конкурсаў...

пускнікоў — безліч кіраўнікоў шматлікіх творчых калектываў, якія рэгулярна атрымліваюць найвышэйшыя ўзнагароды на самых прэстыжных міжнародных конкурсах і фестывалях. Вельмі ўразілі і лічбы: колькі падрыхтаваных кафедрай артыстаў працуе ў вядучых дзяржаўных калектывах нашай краіны. Да прыкладу, у адным толькі Ансамблі танца Унутраных войск Беларусі — іх ажно тры чвэрці ад агульнага складу.

Ці зможа адна праграма змясціць усё лепшае? Канешне ж, не. Напярэдадні праходзілі і фальклорная вечарына, і "круглы стол", што сабраў прадстаўнікоў рэгіянальных каледжаў мастацтваў на абмеркаванне набалелых праблем. А ў святочным канцэрце выступілі і гасцявыя калектывы, якімі кіруюць былыя выхаванцы, і цяперашнія студэнты. Сапраўднай кульмінацыяй станавіліся стыльныя, папраўдзе віртуозныя бальныя нумары, што набывалі сюжэтныя абрысы, а таксама надзвычай разнастайныя і заўжды крэатыўныя кампазіцыі, выкананыя пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры Святланы Гуткоўскай.

Зарад маладой энергіі і аптымізму можна было атрымаць на кожным канцэрце фестывалю. Наперадзе — яшчэ два. Сустрэнемся ў зале!

**Н.Б.**



Фота Івана АСТАШОНКА

**На здымках: акадэмічны хор "Мара"; кампазіцыя "Давай узгадаем!" у выкананні студэнтаў кафедры харэаграфіі БДУКіМ.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ